■ Ход у гісторыю

Дзе на лапы стане касалапы

“Мядзведжая акадэмія” ў свой час праславіла Смаргонь на ўсю Еўропу. А прысвечаны ёй праект фантана – работа Уладзіміра Церабуна – восьмы год толькі абмяркоўваецца.

Праект скульптурнай кампазіцыі “Мядзведжая акадэмія” ў Смаргоні

Смаргонь. Назву гэтага невялікага беларускага горада ведалі з канца васямнаццатага да сярэдзіны дзевятнаццатага стагоддзяў у Эльзасе і Баварыі, Прусіі і Францыі не дыпламаты і правіцелі, а простыя і зусім непісьменныя людзі. Славу гэтую разносілі па ўсёй Еўропе чатырохлапыя артысты і іх смуглатварыя вандроўнікі-гаспадары. “Мядзведжая акадэмія” была ў той час адзінай установай у Еўропе, дзе дрэсіравалі мядзведзяў, вучылі іх танцаваць. З гандлёвых плошчаў, дзе рамесны і гарадскі люд збіраўся на прадстаўленні, разыходзілася слава пра Смаргонь.

Сёння мядзведзяў у Смаргоні не дрэсіруюць. Ды і ў вакольных лясах касалапага рэдка сустрэнеш. Чаму б тады не захаваць памяць пра гэтую старонку гісторыі для жыхароў і гасцей горада? Скульптар Уладзімір Церабун, ураджэнец Смаргоншчыны і вялікі патрыёт сваёй малой радзімы, сем гадоў таму, калі Смаргонь рыхтавалася да пяцісотгоддзя, прапанаваў эскіз незвычайнага фантана, у склад якога ўвайшлі скульптуры артыстаў-мядзведзяў і іх павадыроў.

З таго часу мінула восем год, а праект фантана-скульптуры так і застаецца “ў стадыі абмеркавання”, толькі кошт яго выканання вырас з 90 да 350 мільёнаў рублёў.

На думку Уладзіміра Церабуна, ва ўсіх значных падзеях айчыннай гісторыі Смаргонь займае не апошняе месца. А таму законна прэтэндуе на статус горада-помніка.

А што думаюць наконт гэтага самі смаргонцы?

Ядзвіга Брылеўская нарадзілася ў 1911 годзе і сёлета ў чэрвені разлічвае адзначыць сваё стагоддзе. Яна памятае, як у дзяцінстве яны гулялі на ўскрайку Смаргоні, на знакамітых “французскіх горках”. Чаму горкі названыя французскімі, тады ні для каго не было сакрэтам. Бо ў тыя гады тут, дзе цяпер пралягла вуліца Танкавая і месцяцца старыя гарадскія могілкі, часта знаходзілі французскія гузікі і залатыя манеты. Зразумела, знаходкі стараліся не афішываць – за залатыя грошы можна было разжыцца. Але часцей у пошуках манетак гараджане знаходзілі ашыйнікі і іх абломкі, рэшткі старых бубнаў і вялізных, бы патэльні, жароўняў. “Французскія горкі” – быццам назнарок створаныя прыродай пагоркі, якія прадпрымальныя смаргонцы прыстасавалі для навучання касалапых: у глыбіні гэтых пагоркаў яны выкопвалі глыбокія, але нешырокія ямы, у якіх на невялікай вышыні ўсталёўвалі дніішчы-патэльні. На дно ямін апускалі вуголле, якое, тлеючы, падагравала патэльню, і мядзведзь пераступаў лапамі ад гарачыні пад гукі бубна. Пазней ён прывыкаў і, пачуўшы бубен, пачынаў пераступаць лапамі – танцаваць.

А вось меркаванне яе сына Віктара Брылеўскага:

– Даўно надышоў час аддаць даўгі продкам і захаваць тое, што адбывалася ў горадзе на працягу стагоддзяў – знакамітыя падзеі, імёны слынных людзей, важныя факты не ў бібліятэках і сховішчах, а ў назвах вуліц, у помніках, мемарыялах, памятных дошках. Я за тое, каб у Смаргоні як мага хутчэй з’явіўся помнік-скульптура выхаванцам “Мядзведжай акадэміі”.

Смаргонская пенсіянерка Надзея Маркава лічыць, што прэтэндаваць на горад-помнік у Смаргоні – зусім не павышаныя амбіцыі. А помнік у гонар “Мядзведжай акадэміі” – гэта помнік прадпрымальнаму і загартаванаму гісторыяй мясцоваму люду.

– Мядзведзяў у вакольных лясах у тыя часы было шмат, і таму, каму ўдавалася іх злавіць, плацілі шчодра. Вось і рызыкавалі людзі жыццём. Не дзеля грошай стараліся – за кожнае адлоўленае і дастаўленае мядзведзяня пан шчодра разлічваўся надзеламі зямлі. Да таго ж школа давала заробак сотням вандроўных мядзведжых павадыроў. Таму буду вельмі рада, калі помнік школе дрэсіроўкі мядзведзяў з’явіцца ў Смаргоні. Вядома, ставіць яго трэба не ў раёне “французскіх горак”, а ў цэнтры горада. Ні ў якім разе не ў парку – ён і так перанасычаны кампазіцыямі і помнікамі. Яшчэ можна было б паставіць помнік абаранку. А што? Ёсць жа ў Шклове помнік агурку. А нашыя смаргонскія абаранкі – таксама гімн прадпрымальніцтву. Гэтае печыва вынайшлі смаргонцы, калі вярнуліся на папялішчы родных хат пасля першай сусветнай вайны. Патрэбна было адбудоўвацца, а як зарабіць грошы? Вось і адпраўляліся са Смаргоні ў Маскву, Варшаву і Вільню цэлыя караваны з баранкамі. Каб ласункі не псаваліся доўгі час, смаргонскія пекары вынайшлі рэцэпт асаблівага абварнога цеста. І форму вынайшлі, каб можна было нанізваць печыва на вяровачку і не пагубляць.

> **“Яшчэ можна было б паставіць помнік абаранку. Нашы смаргонскія абаранкі – гімн прадпрымальніцтву. Гэтае печыва вынайшлі смаргонцы, калі вярнуліся на папялішчы родных хат пасля першай сусветнай вайны. Патрэбна было адбудоўвацца, а як зарабіць грошы? Вось і адпраўляліся са Смаргоні ў Маскву, Варшаву і Вільню цэлыя караваны з абаранкамі.**

Інжынер ААТ “Смаргоньсілікатабетон” Аляксандр Касцючэнка лічыць так:

– Помнік павінен стаяць там, дзе і знаходзіліся гэтыя школы – у раёне старых гарадскіх могілак, дзе зліваюцца дзве ракі – Оксна і Гервятка. Ствараем турыстычныя аб’екты мы самі. І яны павінны знаходзіцца на тых месцах, якія прапанавала нам гісторыя. На могілках ёсць помнікі рускім салдатам 1812 года і першай сусветнай вайны.

Наталія ВАЛЫНЕЦ

КАМПЕТЭНТНА

Уладзімір ЦЕРАБУН, скульптар, стваральнік праекта скульптурнай кампазіцыі “Мядзведжая акадэмія”:

– Ці быць Смаргоні горадам-помнікам? Ды ён такім і з’яўляецца. Такая роля наканавана маёй малой радзіме самой гісторыяй. Гэнаруся, што ў складзе аўтарскага калектыву распрацоўваў праект мемарыяльнага комплексу па лініі супрацьстаяння ў гады першай сусветнай вайны. Скульптуры для мемарыяла ўжо гатовыя, размесціцца ён па ўсяму гораду і нават за горадам, надаўшы Смаргоні воблік аднаго з турыстычных цэнтраў Беларусі.

Эскіз жа “Мядзведжай акадэміі” я распрацаваў, як вы ведаеце, да 500-годдзя горада. Помнік сам па сабе цікавы – ён будзе выкананы ў форме фантана, але без традыцыйнай чашы і бардзюра: вада будзе струменіць з зямлі і збягаць пад ухілам. Вызначана месца пад устаноўку, праектна-каштарысная дакументацыя гатова. Другі раз мы звярнуліся да яго ў 2009 годзе, калі Смаргонь рыхтавалася да Дня беларускага пісьменства. Зноў безвынікова. Зараз ужо самі смаргонцы звярнуліся да ўдзельнікаў Усебеларускага народнага сходу, каб ажыццявіць праект. Значыць, гораду помнік патрэбен.

Каб рэалізаваць праект, не хапае фінансавых сродкаў. Але інвестыцыі ў захаванне гістарычнай спадчыны акупяцца. Да значных аб’ектаў пацягнуцца турысты, будуць выкладваць сродкі. А Смаргоні ёсць чым здзівіць у гэтым сэнсе нават замежнага турыста. Проста мы павінны падаць, паказаць знакавыя для нашай гісторыі аб’екты. У палацы Агінскага ў Залессі павінна з’явіцца канферэнц-зала, каб можна было і канцэрты праводзіць, і канферэнцыі. Будучае Крэва бачу ў рэканструкцыі замка – накшталт таго, які зрабілі ў Лідзе. Ёсць у нас сядзіба Францішка Багушэвіча ў Кушлянах. Канешне, для таго, каб турысты валам валілі ў Смаргонь, не толькі помнікі патрэбныя, але і іншая турыстычная інфраструктура. Зараз жа ў горадзе нават грамадскіх прыбіральняў не хапае, не кажучы ўжо пра гасцініцы і кафэ.

grodnonews.by
Еще больше читайте на нашем сайте

■ В седло

Ход с конем

В мае Гродненская погрангруппа сможет похвастаться собственной кавалерией. Пограничники приступят к охране государственной границы на лошадях.

В течение двух лет в эксперименте, инициатором которого стал Госпогранкомитет, будет задействована застава Гродненской погрангруппы, в зоне ответственности которой территория Августовского канала. Участок конного патрулирования выбран не случайно.

– Сегодня охрана границы в районе заставы имени Усова ведется в пешем порядке и с применением машин, – рассказал полковник Андрей Филатов, начальник службы охраны границы. – Использование лошадей на этом участке облегчит труд пограничникам и повысит эффективность их работы. Кроме того, несение службы на лошадях органично впишется в систему природоохранных мероприятий.

Уже известно, что «служить» в погрангруппе будут четыре лошади. Все необходимое для их содержания сегодня имеется.

– В советское время они часто использовались для охраны государственной границы, – пояснил Андрей Викторович. – Опыт такой работы был и у нас на первой и второй заставах. Базы для содержания животных сохранились с того времени.

Не возникло проблем и в подготовке кадров. Среди военнослужащих нашлись те, кто не просто имеет опыт верховой езды, но и конную подготовку. Кавалеристам нужно лишь восстановить прежние навыки. Планируется, что помощь в их подготовке окажут Гродненский мясокомбинат и СПК «Вертелишки», в распоряжении которых имеются школы верховой езды.

Екатерина КУРОЧКИНА